# Беларуская мова. IV клас

## Раздзел «Тэкст»

Вывучэнне раздзела «Тэкст» у IV класе накіравана на адпрацоўку ў вучняў уменняў вылучаць асноўныя прыметы тэкстаў, аналізаваць іх будову, ствараць самастойныя вусныя і пісьмовыя выказванні розных відаў, на фарміраванне ўяўленняў пра сродкі сувязі сказаў у тэксце, пра ролю вобразна-выяўленчых сродкаў мовы ў тэксце, на знаёмства з асаблівасцямі будовы тэкстаў розных тыпаў (апавяданне, апісанне, разважанне).

Дыдактычным матэрыялам практыкаванняў у асноўным з'яўляюцца тэксты, якія ўтрымліваюць інфармацыю пра прыроду Беларусі, пра людзей і ўзаемаадносіны паміж імі. Такі падбор матэрыялу дае магчымасць фарміраваць лінгвакультуралагічную кампетэнцыю навучэнцаў. У сувязі з гэтым выкананне любога практыкавання пачынаецца з чытання тэксту, аналізу яго зместу, вылучэння пад кіраўніцтвам настаўніка лінгвакультуралагічнай інфармацыі і асэнсавання яе.

Веды, уменні і навыкі, якія фарміруюцца ў навучэнцаў на аснове працы з тэкстам дапаўняюць тыя, якія былі выпрацаваны ў II–III класах. Актуалізуюцца веды пра выражэнне тэмы або асноўнай думкі ў загалоўку тэксту. Вучні практыкуюцца ў вызначэнні тэмы і фармулёўцы асноўнай думкі тэксту, у складанні і аднаўленні дэфармаванага плана тэксту. Адбываецца знаёмства са сродкамі сувязі сказаў у тэксце (лексічныя паўторы аднаго і таго ж слова або аднакаранёвых слоў, сінонімы, антонімы, выкарыстанне слоў ***ён, яна, яно, яны, гэты, той, там, так***, адзінства часавых форм дзеясловаў), з тыпамі тэкстаў (апавяданне, апісанне, разважанне) і асаблівасцямі іх будовы, з роляй вобразна-выяўленчых сродкаў мовы ў тэксце.

У ходзе выканання практыкаванняў навучэнцы складаюць тэксты розных тыпаў з дапамогай апорных слоў, пашыраюць гатовыя тэксты вобразна-выяўленчымі сродкамі, рэдагуюць тэксты шляхам замены слоў-паўтораў займеннікамі, вызначаюць тып тэксту, падзяляюць яго на сэнсавыя часткі, складаюць план, робяць вусны сціслы і пісьмовы падрабязны пераказ тэксту.

### Урок 5. Сувязь сказаў у тэксце

***Мэты:*** паўтарыць веды навучэнцаў пра тэкст, яго тэму, асноўную думку, пазнаёміць са сродкамі сувязі сказаў у тэксце; узбагачаць слоўнікавы запас навучэнцаў прыказкамі пра працу, развіваць звязнае пісьмовае маўленне; выхоўваць працавітасць.

***Абсталяванне:*** карткі са словамі.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце запісаны верш. На каго падобная восень у ім? Чаму паэтэса называе восень мастачкай? Прачытайце словы, у якія ўставілі літару *ц*. Якім правілам вы карысталіся? Прачытайце словы, у якія ўставілі спалучэнне літар *дз*. Якім правілам вы карысталіся? Якія дзеясловы вы падкрэслілі ў сказах? *(Працуе, падносіць, гайдае.)* У форме якога часу і ліку ўсе яны ўжыты? *(У форме цяперашняга часу адзіночнага ліку.)* Якія з гэтых дзеясловаў ужыты ў пераносным значэнні? *(Працуе, падносіць.)* Складзіце сказы з дзеясловамі *працуе, падносіць*. Выкарыстайце гэтыя дзеясловы ў сказах у прамым значэнні. *(Выслухоўваюцца адказы вучняў.)*

**II. Вывучэнне новага матэрыялу.**

***1. Актуалізацыя ведаў вучняў.***

— Адгарніце падручнік на с. 16 і разгледзьце схему. Успомніце, чым аб'яднаны сказы ў тэксце. *(Тэмай і асноўнай думкай.)* Што такое тэма (асноўная думка) тэксту? Што можа ўказваць на тэму або асноўную думку тэксту? *(Яго загаловак.)*

***2. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.***

— Мы пачынаем вывучаць тэму «Тэкст». Сёння на ўроку даведаемся, што дапамагае звязаць сказы ў тэксце.

***3. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 24.

— Прачытайце. (Вучні чытаюць тэкст самі сабе.) Дакажыце, што вы прачыталі тэкст. *(Сказы ў ім аб'яднаны тэмай і асноўнай думкай.)* Якая тэма тэксту? *(Пасадка каштанаў вучнямі для добраўпарадкавання тэрыторыі побач са школай.)* Якая асноўная думка тэксту? *(Пасадка дрэў — карысная і прыемная справа.)* На што ўказвае загаловак тэксту? *(На яго тэму.)*

— Назавіце словы, якія паўтараюцца ў тэксце. *(Каштаны, пустка, дзеці.)* Прачытайце сказы са словамі *дзеці, каштаны*. Якія словы выкарыстоўваюцца замест слова *каштаны* ў другім і трэцім сказах? *(Саджанцы, яны, дрэўцы.)* Які прыметнік спалучаецца са словам *пустка* ў першым сказе? *(Сумнай.)* Як названа былая пустка ў апошнім сказе? *(Утульным і вясёлым месцейкам.)* Назавіце антонімы, якія выкарыстаны ў першым і апошнім сказах. *(Сумны — вясёлы.)* Запішыце гэтую пару слоў. Знайдзіце ў тэксце дзеясловы і выпішыце іх у два слупкі: у адзін слупок дзеясловы ў форме прошлага часу, у другі — у форме будучага часу. (Адзін

вучань працуе каля дошкі, астатнія выпісваюць дзеясловы ў сшыткі.) Якіх дзеясловаў больш? *(Дзеясловаў у форме прошлага часу.)* Як вы думаеце, што дапамагло звязаць сказы ў прачытаным тэксце? (Вучні выказваюць свае меркаванні.)

Праца з рубрыкай «Завяжы вузялок!».

Настаўнік знаёміць вучняў з матэрыялам рубрыкі на с. 17 і задае пытанні: што дапамагае звязаць сказы ў тэксце? Якія з пералічаных сродкаў сувязі выкарыстаны ў тэксце «Каштаны каля школы»? *(Антонімы, слова* яны, *паўтор аднаго і таго ж слова, дзеясловы ў форме прошлага часу.)*

Практыкаванне 25.

— Прачытайце тэкст. (Вучні чытаюць тэкст ланцужком.) Як хлопчык дапамагаў бацьку? Як дрэвы дзякавалі яму? (Выслухоўваюцца адказы вучняў.) Звярніцеся да слоўніка ў практыкаванні і адкажыце, якое значэнне мае слова *гатунак (разгалістая).* Прачытайце сказы, у якіх сустракаюцца словы *Антось, сад, яблыні.* (Вучні чытаюць першы — трэці і пяты — восьмы сказы.) Якія словы выкарыстоўваюцца замест іх у іншых сказах? *(Антось — сын, хлопчык, яму; сад — дрэвы; яблыні — дрэвы, яны.)* Назавіце аднакаранёвыя словы, якія сустрэліся ў тэксце. *(Яблыні — яблыкі.)* Якое слова выкарыстоўваецца замест *яблыкі* ў апошнім сказе? *(Плады.)*

— На колькі частак можна падзяліць тэкст? Пра што ідзе размова ў кожнай частцы? (Выслухоўваюцца меркаванні вучняў.) Прачытайце план на старонцы 18. Ці адпавядае паслядоўнасць пунктаў плана паслядоўнасці частак у тэксце? *(Не.)* Як яе трэба змяніць? *(3 — 2 — 1.)* Запішыце выпраўлены план. (Вучні самастойна запісваюць план тэксту.) Прачытайце тую частку тэксту, якой адпавядае малюнак. (Адзін з вучняў зачытвае першую частку тэксту.) Спішыце яе. (Вучні самастойна запісваюць частку тэксту.) Падкрэсліце ў запісаных сказах дзеясловы ў форме прошлага часу. (Пасля выканання задання адзін вучань называе падкрэсленыя дзеясловы.)

— Звярніцеся яшчэ раз да рубрыкі «Завяжы вузялок!» і назавіце сродкі сувязі сказаў у тэксце «Самыя смачныя яблыкі». *(Аднакаранёвыя словы, слова* яны, *дзеясловы ў форме прошлага часу.)*

***4. Праца са слоўнікавым словам ахвотна.***

— У тэксце вам сустрэлася слова *ахвотна.* Сёння мы пазнаёмімся з яго правапісам. Вымавіце слова і назавіце па парадку гукі ў ім. Колькі гукаў і колькі літар у слове? Перакладзіце гэтае слова на рускую мову. *(Охотно.)* Якім гукам адрозніваецца вымаўленне беларускага слова і рускага адпаведніка? *(Гукам* [в].*)* Запішыце слоўнікавае слова, арфаграфічна правільна прагаворваючы яго.

Вучням раздаюцца карткі са словамі:

| |
|---|
| ☐ Ахвота, ахвотны, ахвотнік, ___________. |
| ☐ З радасцю, з прыемнасцю, ___________. |

— Прачытайце. Дапоўніце кожны радок слоўнікавым словам. Адзначце радок, у якім запісаны аднакаранёвыя словы.

***5. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 26.

— Прачытайце першую прыказку. Як вы думаеце, якое значэнне мае дзеяслоў *харашыць? (Надаваць прыгожы, прывабны выгляд.)* Да зместу якога тэксту з тых, што прачыталі на ўроку, яна падыходзіць? *(Да зместу тэксту «Каштаны каля школы».)* Прачытайце другую прыказку. Калі так гавораць? *(Калі ў чалавека нічога не атрымліваецца, таму што ён не хоча рабіць нейкую справу.)* Знайдзіце ў гэтай прыказцы аднакаранёвае слова да слоўнікавага. *(Ахвоты.)* Прачытайце трэцюю прыказку. Што можа даць чалавек зямлі? *(Ён можа апрацоўваць яе, сеяць у зямлю насенне, садзіць саджанцы.)* Што дае ў адказ чалавеку зямля? *(Збожжа, плады.)* Да зместу якога тэксту з тых, што прачыталі на ўроку, яна падыходзіць? *(Да зместу тэксту «Самыя смачныя яблыкі.»)* Запішыце тую прыказку, якая не падыходзіць да зместу прачытаных на ўроку тэкстаў. (Запіс з каменціраваннем.)

Практыкаванне 27.

— Прачытайце сказы. Ці ўтвараюць яны тэкст? *(Так.)* Дакажыце. (Вучні абгрунтоўваюць свой адказ.) Якія словы паўтараюцца ў тэксце? *(Хлопчыкі, клёнік.)* Як пазбегнуць вялікай колькасці паўтораў? *(Замяніць некаторыя з гэтых слоў.)* Папрацуйце ў парах і выправіце тэкст. Выкарыстайце словы правага слупка. (Вучні ў парах вусна рэдагуюць тэкст. Пасля выканання задання заслухоўваюцца тэксты некалькіх пар вучняў. Выбіраецца і запісваецца на дошцы і ў сшытках лепшы варыянт выпраўленага тэксту.) Яшчэ раз перачытайце запісаны тэкст. Які загаловак можна яму даць? *(«Клёнік» або «Добрая справа».)* На што ўказвае падабраны загаловак: на тэму ці на асноўную думку тэксту?

**III. Дамашняе заданне.**

Практ. 28.

— Дома вам неабходна будзе спісаць тэкст, устаўляючы ў словы патрэбныя літары, і вызначыць, пры дапамозе чаго звязваюцца сказы ў ім.

**IV. Падвядзенне вынікаў урока.**

— Чым аб'яднаны сказы ў тэксце? Што дапамагае звязаць сказы ў тэксце?

## Урок 6. Тыпы тэкстаў

***Мэты:*** пазнаёміць з тыпамі тэкстаў, іх асаблівасцямі; вучыць адрозніваць тэксты-апавяданні, тэксты-апісанні, тэксты-разважанні, вызначаць тып тэксту па прапанаваных загалоўках; узбагачаць слоўнікавы запас навучэнцаў прыказкамі пра сям'ю і сваякоў, развіваць вуснае звязнае маўленне; выхоўваць любоў і паважлівыя адносіны да матулі.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце тэкст. Якія правілы правапісу вы прымянілі, каб уставіць у словы прапушчаныя літары? *(Правілы правапісу літар о, э — а і літар е, ё — я.)* Раскажыце гэтыя правілы. Пры запісе якіх слоў выкарысталі правіла правапісу літар *е, ё — я*? *(Мясцінку, весела.)* Якія літары ўставілі ў гэтыя словы?

Чаму? Пры запісе якіх слоў выкарысталі правіла правапісу літар *о, э — а*? *(Жэня, баравікоў.)* Якія літары ўставілі ў гэтыя словы? Чаму? Падбярыце да слова *баравікоў* аднакаранёвае так, каб замест *а* трэба было пісаць *о*. *(Бор.)* Якія назоўнікі ёсць у першым сказе? *(Жэня, Алёша, Янка, грыбоў.)* Якімі словамі замяняюцца назоўнікі *Жэня, Алёша, Янка* ў іншых сказах? *(Яны, ва ўсіх, хлопчыкі, сябры.)* Якімі словамі замяняецца назоўнік *грыбоў* у іншых сказах? *(Баравікоў, знаходкамі.)* Якія аднакаранёвыя словы сустрэліся ў тэксце? *(Грыбоў — грыбную, баравікоў — бор.)* Які корань вы вылучылі ў іх? Знайдзіце ў тэксце дзеясловы ў форме прошлага часу і назавіце іх. *(Вярталіся, натрапілі, набралі, быў, перагаворваліся, хваліліся, скончыўся, была, прыбавілі.)* Пры дапамозе чаго звязаны сказы ў тэксце «На лясной дарозе»? *(Пры дапамозе аднакаранёвых слоў, дзеясловаў у форме прошлага часу, слоў Жэня, Алёша, Янка — яны — хлопчыкі — сябры, грыбы — баравікі — знаходкі.)*

**II. Вывучэнне новага матэрыялу.**

***1. Актуалізацыя ведаў вучняў.***

— Што вы ўжо ведаеце пра тэкст? (Вучні прыгадваюць прыметы тэксту.) Што дапамагае звязаць сказы ў тэксце?

***2. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.***

— Сёння мы пазнаёмімся з тыпамі тэкстаў, будзем вучыцца адрозніваць тэксты розных тыпаў.

***3. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 29.

— Прачытайце тэксты. (Тры вучні па чарзе чытаюць тэксты.) Якая тэма іх аб'ядноўвае? *(Адносіны мамы і яе дзіцяці.)* У якім тэксце расказваецца пра падзеі, што адбываюцца з маці і яе дзіцем? *(У тэксце «Жоўцік».)* Колькі малюнкаў адпавядае зместу гэтага тэксту? *(Тры.)* Што адлюстравана на кожным малюнку? *(Дзеянні і падзеі, якія адбываюцца з галоўнымі героямі.)* У якім тэксце апісваюцца маці і дзіця? *(У тэксце «Сонечным днём».)* Колькі малюнкаў адпавядае зместу гэтага тэксту? *(Адзін.)* Хто на ім намаляваны? *(Мама і дачушка.)* Як вы здагадаліся? *(Малюнак адпавядае таму апісанню галоўных тэраінь, якое даецца ў тэксце.)* У якім тэксце даказваецца вялікая роля маці ў жыцці дзіцяці? *(У тэксце «Самы дарагі чалавек».)* Як вы думаеце, чаму складана перадаць на малюнку змест трэцяга тэксту? (Вучні выказваюць свае меркаванні. Настаўнік абагульняе адказы дзяцей і звяртае ўвагу на тое, што ў трэцім тэксце даказваецца пэўная думка, а не апісваюцца канкрэтныя героі і не расказваецца пра канкрэтныя падзеі. ' сувязі з гэтым, да тэксту можна маляваць розныя алюнкі мам і іх дзяцей, але ні адзін з малюнкаў поўнай меры не адлюструе змест тэксту.) Чым розніваюцца тры тэксты на адну тэму? (Вучні вызваюць свае меркаванні.)

Праца з правілам.

Настаўнік чытае правіла на с. 22 і задае пытанна якія тыпы падзяляюцца тэксты? Як вы дуце, які з тэкстаў практыкавання 29 з'яўляецца аннем, які — апавяданнем, а які — разважаннем? (Вучні выказваюць свае меркаванн верыць нашы меркаванні, звернемся да практыкавання.

Практыкаванне 30.

— Разгледзьце схему. Што перадаецц це тэксту-апавядання (тэксту-апісання разважання)? На якое пытанне дае адка апавяданне (тэкст-апісанне, тэкст-разва Ці правільна мы вызначылі тыпы тэкстаў тыкавання 29? Запішыце тэкст-апавяданне з каменціраваннем.) Назавіце словы, якія д гаюць звязаць сказы ў тэксце «Жоўцік». *(Ж ён — куранятка, маці — курыца — яе, паўтс* Жоўцік, маці, *дзеясловы ў форме прошлага*

Практыкаванне 31.

— Прачытайце. Якое значэнне мае слова *дае*? Пра якія адносіны паміж матуляй і дзець ворыцца ў прыказках? (Выслухоўваюцца мерка вучняў.) Да зместу якіх тэкстаў з практыкавані падыходзіць першая прыказка? *(«Жоўцік», «С дарагі чалавек».)* Спішыце прыказку, раскрыва дужкі. (Запіс з каменціраваннем.) З якім тэкс суадносіцца другая прыказка? *(«Сонечным днё*

Практыкаванне 32.

— Адкажыце, на што можа ўказваць загаловак т сту. *(На тэму або асноўную думку тэксту.)* Як вы дум еце, ці можа загаловак стаць падказкай у вызначэн тыпу тэксту? (Вучні выказваюць свае меркаванн Паспрабуйце вызначыць тып тэксту па прапанавань загалоўках. *(«Як мы з мамай хадзілі ў тэатр» — апа вяданне, «Маміна калекцыя лялек» — апісанне, «Ма мама — рукадзельніца» — разважанне.)* Калі некаторыя з вучняў вызначылі тып тэксту «Мая мама — рукадзельніца» як апісанне, то трэба ўдакладніць у іх, пра што будзе ісці размова ў гэтым тэксце (у ім будзе давацца апісанне ўсяго таго, што мама робіць сваімі рукамі).) Апішыце словамі малюнкі, якія можна намаляваць да тэксту-апавядання. (Заслухоўваюцца адказы некалькіх вучняў.) Што б вы адлюстравалі на малюнку да тэксту-апісання? (Заслухоўваюцца адказы некалькіх вучняў.)

Развіццё маўлення.

— Раскажыце, чым любяць займацца вашы сваякі. Якія калекцыі ёсць у іх? Ці маеце вы сваю калекцыю? Якая рэч самая каштоўная ў ёй? (Заслухоўваюцца выказванні некалькіх вучняў.)

**III. Дамашняе заданне.**

Практ. 33.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе аднавіць дэфармаваны тэкст, вызначыць яго тып, знайсці і падкрэсліць словы, якія дапамагаюць звязаць сказы ў тэксце.

**IV. Падвядзенне вынікаў урока.**

— На якія тыпы падзяляюцца тэксты? Назавіце асаблівасці тэксту-апавядання (тэксту-апісання, тэксту-разважання).

## Урок 7. Тэкст-апавяданне

***Мэты:*** пазнаёміць са схемай пабудовы і моўнымі сродкамі тэксту-апавядання

тэкст-апавяданне, адпрацоўваць уменне вылучаць сродкі сувязі сказаў у тэксце-апавяданні; узбагачаць слоўнікавы запас вучняў тэматычнай групай слоў «пошта», развіваць вуснае звязнае маўленне; выхоўваць ветлівасць, клапатлівыя адносіны да людзей.

***Абсталяванне:*** карткі са схемай, карткі з лічылкай для слоўнікавай працы.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце тэкст, які ў вас атрымаўся. (Заслухоўваюцца тэксты некалькіх вучняў.) Пры дапамозе чаго звязаны сказы ў гэтым тэксце? Якія словы вы падкрэслілі? *(Вераб'іха — яна — мама, дзетак — яны — іх — ім — малыя — птушаняты, гадавала, сталі, карміла, насіла, разяўлялі, раслі.)* Да якога тыпу належыць гэты тэкст? *(Апавяданне.)* Дакажыце. Якія яшчэ бываюць тыпы тэксту?

**II. Паўтарэнне.**

Вучням раздаюцца карткі са схемай.

**Тыпы тэкстаў**

| | | |
|---|---|---|
| Тлумачыцца, даказваецца штосьці; гаворыцца пра прычыны падзей і з'яў | Расказваецца пра дзеянні і падзеі, што ідуць адно за адным | Апісваюцца прадметы, людзі, жывёлы, малюнкі прыроды |

— Зараз вам неабходна будзе ўспомніць асаблівасці тэкстаў розных тыпаў. Разгледзьце схему. Дапішыце ў пустыя радкі адпаведныя назвы тыпаў тэкстаў. (Пасля самастойнага выканання задання вучнямі праводзіцца самаправерка з выкарыстаннем табліцы на с. 22 падручніка.)

**II. Вывучэнне новага матэрыялу.**

***1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.***

— Сёння мы больш падрабязна пазнаёмімся з будовай тэксту-апавядання, будзем вучыцца складаць тэксты гэтага тыпу.

***2. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 34.

— Прачытайце тэкст. (Чытанне апавядання вучнямі па частках.) Як Віця дапамагае маме? За што ўдзячны яму вяскоўцы? (Выслухоўваюцца адказы вучняў.) На што ўказвае загаловак тэксту: на тэму ці на асноўную думку? *(На тэму.)* Колькі малюнкаў вы б намалявалі да тэксту? Апішыце іх словамі. (Вучні робяць слоўныя малюнкі ў паслядоўнасці апавядання.) Звярніцеся да схемы на картках і адкажыце, што перадаецца ў змесце гэтага тэксту. *(Дзеянні і падзеі, што ідуць адно за адным.)* Да якога тыпу належыць тэкст? *(Апавяданне.)* Колькі частак можна вылучыць у тэксце? *(Тры.)* Давайце складзём і запішам яго план. Прачытайце першую (другую, трэцюю) частку. (Адзін вучань чытае патрэбную частку тэксту.) Якую назву можна ёй даць? (Выслухоўваюцца прапановы вучняў, выбіраецца і запісваецца найбольш удалая назва.)

*Прыкладны план:*

*1. Падрыхтоўка пошты.*

*2. Мамін памочнік.*

*3. Удзячныя мама і вяскоўцы.*

Праца з рубрыкай «Завяжы вузялок!».

— Давайце звернемся да рубрыкі «Завяжы вузялок!» на с. 24, дзе змешчана важная інфармацыя, якую трэба памятаць, і даведаемся, з якіх частак складаецца тэкст-апавяданне. (Спачатку настаўнік, а потым вучні чытаюць інфармацыю, змешчаную ў рубрыцы.)

Практыкаванне 35.

— Прачытайце тую частку тэксту «Маленькі памочнік», якая з'яўляецца пачаткам падзей, дзеяння. (Адзін вучань чытае першую частку тэксту.) Назавіце ў гэтай частцы словы, што служаць для сувязі сказаў у тэксце. *(**Маці — яна**, паўтор слова **кучка**, **дзве — адна — другая**, антонімы **левага — правага**, дзеясловы ў форме прошлага часу.)* Выпішыце з гэтай часткі дзеясловы ў форме прошлага часу. (Вучні самастойна выконваюць заданне. Пасля выканання праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.) Прачытайце тую частку тэксту, якая з'яўляецца развіццём падзей, дзеяння. (Адзін вучань чытае другую частку тэксту.) Выпішыце з гэтай часткі дзеясловы ў форме прошлага часу. (Вучні самастойна выконваюць заданне. Пасля выканання праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.) Вусна перакажыце першую і другую часткі тэксту з апорай на запісаныя дзеясловы. (Заслухоўваюцца пераказы некалькіх вучняў.) Запішыце заключную частку тэксту. (Вучні самастойна выконваюць заданне.) Назавіце ў ёй дзеясловы. У форме якога часу ўжыты гэтыя дзеясловы?

Праца з рубрыкай «Завяжы вузялок!».

— Прачытайце матэрыял рубрыкі «Завяжы вузялок!» на с. 25 і адкажыце на пытанне: слоў якой часціны мовы шмат у тэксце-апавяданні? (Вучні самастойна перачытваюць матэрыял рубрыкі і даюць адказ на пытанне.) Як вы думаеце, чаму ў тэксце-апавяданні выкарыстоўваецца шмат дзеясловаў? *(У тэксце гэтага тыпу расказваецца пра дзеянні і падзеі, а дзеяслоў абазначае дзеянне прадмета.)*

***3. Праца са слоўнікавым словам паштальён.***

— У тэксце вам сустрэлася слова *паштальён* і яго форма. Знайдзіце і прачытайце форму гэтага слова. *(Паштальёну.)* Сёння мы пазнаёмімся з правапісам гэтага слова. Вымавіце слоўнікавае слова і назавіце па парадку гукі ў ім. Колькі гукаў і колькі літар у слове? Растлумачце правапіс мяккага знака ў ім. Успомніце з трэцяга класа і назавіце слоўнікавае слова, аднакаранёвае да гэтага. *(Пошта.)* Запішыце слоўнікавае слова і аднакаранёвае да яго, арфаграфічна правільна прагаворваючы іх. Выдзеліце ў словах корань. Якое спалучэнне зычных гукаў вымаўляецца ў корані? Якімі літарамі яно перадаецца на пісьме?

Вучням раздаюцца карткі з лічылкай:

П..штал..ён,
па..тал..ён...
Вось да нас
прыходзіць ён:

— Табе — **ліст**,
табе — п..што..ку.
Калі так —
жмурыся зноўку.
(*У. Мацвеенка* [1, с. 46])

***Зноўку — зноў.***

— Прачытайце лічылку. Дапішыце патрэбныя літары ў словы. Знайдзіце ў лічылцы аднакаранёвыя словы. Выдзеліце ў іх корань. (Пасля самастойнага выканання задання праводзіцца франтальная праверка напісанага.) Падбярыце сінонім да выдзеленага слова і назавіце яго. *(Пісьмо.)*

**III. Замацаванне.**

***Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 36.

— Прачытайце тэкст. (Чытанне сам сабе.) Як выглядае эмблема беларускай пошты? Чаму ражок стаў міжнародным сімвалам пошты? (Выслухоўваюцца адказы вучняў.) Да якога тыпу належыць тэкст? Дакажыце. Колькі частак можна вылучыць у тэксце? *(Тры.)* Давайце складзём і запішам яго план. Прачытайце першую (другую, трэцюю) частку. (Адзін вучань чытае патрэбную частку тэксту.) Якую назву можна ёй даць? (Выслухоўваюцца прапановы вучняў, выбіраецца і запісваецца найбольш удалая назва.)

*Прыкладны план:*

*1. Дарога на пошту.*

*2. Малюнак на скрыні.*

*3. Як узнік міжнародны сімвал пошты.*

— Запішыце частку тэксту, якая передае пачатак дзеяння. (Самастойнае выкананне задання вучнямі.) Назавіце словы, што служаць для сувязі сказаў у гэтай частцы тэксту. *(**Мяне — я — мне, тата — яму, ліст — яго**, паўтор слова **ліст**, **пошту — паштовую**, дзеясловы ў форме прошлага часу.)*

Развіццё маўлення.

— Якія сучасныя сродкі сувязі вы ведаеце? *(Тэлебачанне, радыё, інтэрнэт, электронная пошта, мабільны тэлефон.)* Як можна павіншаваць сваякоў і знаёмых з рознымі святамі? Як можна даслаць ім патрэбную інфармацыю? (Заслухоўваюцца вусныя выказванні вучняў.) Тыя вучні, якія лічаць сябе сапраўднымі знаўцамі тэхнікі, могуць выканаць да наступнага ўрока заданне для эрудытаў на с. 25 і дапоўніць адказы, якія толькі што прагучалі, дадатковай цікавай і карыснай інфармацыяй.

Практыкаванне 37.

— Прачытайце пачатак і канцоўку апавядання. (Чытанне вучнямі ўслых па частках.) Разгледзьце малюнкі. Што адлюстравана на першым (другім, трэцім) малюнку? Прачытайце спалучэнні слоў на с. 26. (Вучні чытаюць самі сабе.) Прыдумайце па малюнках частку апавядання, якой не хапае. Выкарыстайце прачытаныя спалучэнні слоў. (Заслухоўваецца асноўная частка тэксту, складзеная некалькімі вучнямі. Затым адзін вучань чытае першую частку тэксту, другі расказвае асноўную частку тэксту, трэці зачытвае канцоўку.) Перакажыце апавяданне, якое ў нас атрымалася. (Некалькі вучняў падрабязна пераказваюць апавяданне з дапаўненнем асноўнай часткі тэксту.)

**IV. Дамашняе заданне.**

Практ. 38.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе вызначыць тып тэксту, знайсці словы, якія дапамагаюць звязаць сказы ў ім, выпісаць сказы, у якіх ёсць словы з прапушчанымі літарамі, растлумачыць правапіс гэтых слоў.

Вучням, якія будуць рыхтаваць паведамленне пра сучасныя сродкі сувязі, выпісваць з тэксту сказы не трэба.

**V. Падвядзенне вынікаў урока.**

— З будовай тэксту якога тыпу пазнаёміліся на ўроку? З якіх частак складаецца тэкст-апавяданне? Слоў якой часціны мовы шмат у тэксце-апавяданні? Чаму?

## Урок 8. Тэкст-апісанне

***Мэты:*** пазнаёміць са схемай пабудовы і моўнымі сродкамі тэксту-апісання, вучыць складаць тэкст-апісанне, адпрацоўваць уменне падбіраць загаловак да тэксту, складаць яго план; узбагачаць слоўнікавы запас вучняў прыметнікамі са значэннем колеру, якасцяў асобы чалавека, развіваць вуснае звязнае маўленне, назіральнасць навучэнцаў; выхоўваць эстэтычныя пачуцці.

***Абсталяванне:*** карткі з тэкстам для арганізацыі самастойнай працы.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Да якога тыпу належыць тэкст «Як ідуць лісты»? Якія словы дапамагаюць звязаць сказы ў тэксце? *(**Лісты — яны, паштальён — ён, пошта — яна**, паўтор слоў **лісты, паштальён, скрыня**, аднакаранёвыя словы **паштовай — пошта — паштальён, даходзіць — прыходзіць — праходзяць**.)* Прачытайце сказы, якія вы запісалі. Якое слоўнікавае слова сустрэлася ў іх? Якую літару вы ўставілі ў слова *паштальён*? Чаму? Якое аднакаранёвае слова да слоўнікавага сустрэлася ў сказах? Якую літару вы ўставілі ў слова *паштовую*? Чаму? Якія літары вы ўставілі ў словы *машына, раскладваюць, аддзяленні*? Чаму?

Хто з вас падрыхтаваў цікавую інфармацыю пра сучасныя сродкі сувязі і хоча падзяліцца ёю з аднакласнікамі? (Заслухоўваюцца і абмяркоўваюцца паведамленні падрыхтаваных вучняў.)

**II. Паўтарэнне.**

Вучням раздаюцца карткі з тэкстам.

**Навука**

За акном пачулася вароніна карканне. Я адклаў кнігу, падышоў да акна. Каля ганка сядзелі дзве вароны. Перад імі ляжала хлебная скарынка.

Маладая варона каркнула і раскрыла дзюбу. Гультайка хацела, каб маці пакарміла яе. Старая варона толькі круціла галавой. Дачка магла сама справіцца з такой работай. Маладая варона зноў закаркала. Тады маці ўзяла ў дзюбу скарынку, далёка зашпурнула яе.

Вароны кінуліся да спажывы. Маці знарок прыпазнілася. Дачка паспела схапіць скарынку. *(Паводле А. Бадака* [2, с. 89–90]*)*

***Спажыва — здабыча, ежа.***

План

[ ] 1. Урок старой вароны.
[ ] 2. Шум за акном.
[ ] 3. Мэта дасягнута.

— Прачытайце тэкст. Чаму ён мае такую назву? Да якога тыпу належыць тэкст? (Выслухоўваюцца адказы вучняў.) Прачытайце план. Ці адпавядае паслядоўнасць пунктаў плана паслядоўнасці частак у тэксце? (Выслухоўваюцца адказы вучняў.) Лічбамі ў квадрацікаў пазначце правільную паслядоўнасць пунктаў плана. (Вучні самастойна вызначаюць паслядоўнасць пунктаў плана.) З якіх частак складаецца тэкст-апавяданне? Якую назву мае тая частка тэксту, якая передае пачатак дзеяння? *(Шум за акном.)* Развіццё падзей, дзеяння? *(Урок старой вароны.)* Заканчэнне падзей, дзеяння? *(Мэта дасягнута.)*

**III. Вывучэнне новага матэрыялу.**

***1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.***

— Сёння мы больш падрабязна пазнаёмімся з будовай тэксту-апісання, будзем вучыцца складаць тэксты гэтага тыпу.

***2. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 39.

— Прачытайце тэкст. (Чытанне вучнямі па частках.) Як выглядае Сцёпка? Які характар ён мае? Чым хлопчык любіць займацца? (Выслухоўваюцца адказы вучняў.) Прыдумайце загаловак да тэксту. *(«Мой прыяцель Сцёпка».)* Назавіце сінонім да слова прыяцель. *(Сябар.)* Які малюнак вы намалявалі б да тэксту? Апішыце яго словамі. (Вучні робяць слоўны малюнак.) Звярніцеся да схемы на с. 22 і адкажыце, што перадаецца ў змесце гэтага тэксту. *(Апісанне хлопчыка.)* Да якога тыпу належыць тэкст? *(Апісанне.)* Колькі частак можна вылучыць у тэксце? *(Тры.)* Самастойна прачытайце план тэксту на с. 28. Ці адпавядае паслядоўнасць пунктаў плана паслядоўнасці частак у тэксце? *(Не.)* Як яе трэба змяніць? *(2 — 1 — 3.)* Запішыце выпраўлены план.

Праца з рубрыкай «Завяжы вузялок!».

— Давайце звернемся да рубрыкі «Завяжы вузялок!» на с. 28, дзе змешчана важная інфармацыя, якую трэба памятаць, і даведаемся, з якіх частак складаецца тэкст-апісанне. (Спачатку настаўнік, а потым вучні чытаюць інфармацыю, змешчаную ў рубрыцы.) Прачытайце назву той часткі тэксту з практыкавання 39, у якой называецца прадмет апісання (пералічваюцца яго характэрныя прыметы; выказваюцца адносіны да яго).

Практыкаванне 40.

— Выпішыце з тэксту практыкавання 39 прыметнікі, якія дапамагаюць ахарактарызаваць Сцёпку. (Запіс з каменціраваннем.)

Развіццё маўлення (праца ў парах).

— Вусна апішыце свайго сябра або сяброўку. Карыстайцеся тэкстам-падказкай на старонцы 29 і словамі ў дужках. (Вучні ствараюць апісанне свайго сябра або сяброўкі, потым расказваюць яго адно аднаму. Заслухоўваюцца тэксты-апісанні некалькіх вучняў. Настаўнік просіць знайсці ў тэкстах і назваць прыметнікі, пры дапамозе якіх дзеці апісвалі знешні выгляд сваіх сяброў.)

Праца з рубрыкай «Завяжы вузялок!».

— Як вы думаеце, слоў якой часціны мовы шмат у тэксце-апісанні? (Вучні выказваюць сваё меркаванні.) Чаму? *(У тэксце гэтага тыпу апісваюцца людзі, жывёлы, малюнкі прыроды, а прыметнік абазначае прымету прадмета.)* Прачытайце матэрыял рубрыкі «Завяжы вузялок!» на с. 29 і праверце вашы здагадкі. (Вучні самастойна перачытваюць матэрыял рубрыкі.)

**IV. Замацаванне.**

***Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 41.

— Прачытайце тэкст. (Вучні чытаюць самі сабе.) Як выглядае любімы кубачак Міхася? (Заслухоўваюцца адказы вучняў.) Да якога тыпу належыць тэкст? Дакажыце. Якую назву можна яму даць? *(«Любімы кубачак».)* Колькі частак можна вылучыць у тэксце? *(Тры.)* Давайце складзём і запішам яго план. Прачытайце першую (другую, трэцюю) частку. (Адзін вучань чытае патрэбную частку тэксту.) Якую назву можна ёй даць? (Выслухоўваюцца прапановы вучняў, выбіраецца і запісваецца найбольш удалая назва.)

*Прыкладны план:*

*1. Фарфоравы кубачак.*

*2. Цікавае ўпрыгажэнне на любімым кубку.*

*3. Кацiная мордачка блішчыць чысцінёй.*

— Запішыце частку тэксту, у якой апісваецца, як выглядае любімы кубачак Міхася. Знайдзіце і падкрэсліце ў ёй прыметнікі. (Самастойнае выкананне задання вучнямі. Пасля выканання задання арганізоўваецца ўзаемаправерка.)

Развіццё маўлення.

— У каго з вас ёсць свой любімы кубачак? Прачытайце словы на старонцы 30. Выкарыстаўшы патрэбныя словы, адкажыце на наступныя пытанні: з якога матэрыялу зроблены ваш любімы кубачак? Які ён па памеры? Якога ён колеру? Чым упрыгожаны ваш кубачак? Вусна складзіце апісанне свайго любімага кубачка. (Заслухоўваюцца выказванні некалькіх вучняў.)

Практыкаванне 42.

— Прачытайце тэкст. (Чытанне вучнямі ўслых па частках.) Чым упрыгожаны асенні лес? Чаму рознакаляровае лісце ляжыць не на сваім месцы? (Выслухоўваюцца адказы вучняў.) Да якога тыпу належыць тэкст? Дакажыце. Якую назву можна яму даць? *(«На лясной палянцы», «Прыгажосць на палянцы».)* Колькі частак можна вылучыць у тэксце? *(Тры.)* Што з'яўляецца прадметам апісання ў тэксце? *(Асенняе лісце на лясной палянцы.)* Прачытайце тую частку тэксту, у якой аўтар называе прадмет апісання. Дзе ляжыць лісце

з асіны, дуба, рабіны, бярозы? Прачытайце тую частку тэксту, у якой вы знайшлі адказ на пытанне. Якія пачуцці ўзнікаюць у аўтара ад убачанага? Прачытайце адпаведную частку тэксту. Самастойна прачытайце план тэксту на с. 31. Ці адпавядае паслядоўнасць пунктаў плана паслядоўнасці частак у тэксце? *(Не.)* Як яе трэба змяніць? *(2 — 1 — 3.)* Запішыце выпраўлены план. (Адзін вучань выконвае заданне на дошцы, астатнія — у сшытках.) Знайдзіце ў тэксце прыметнікі. З якімі назоўнікамі яны звязаны па сэнсе? (Вучні па чарзе называюць спалучэнні слоў «прыметнікі + назоўнік»: *асенняе лісце, яркімі вугольчыкамі, барвовыя лісты, пад чырвонай асінай, дубовыя лісточкі, пад залацістым клёнам, бурае лісце, з жоўтага лісця.* Па меры называння словазлучэнняў дзецьмі настаўнік запісвае іх насупраць адпаведных пунктаў плана.) Вусна перакажыце тэкст па плане. Выкарыстайце названыя спалучэнні слоў. (Заслухоўваюцца вусныя пераказы, зробленыя некалькімі вучнямі.)

**V. Дамашняе заданне.**

Практ. 43.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе вызначыць тып тэксту, спісаць яго частку, устаўляючы ў словы патрэбныя літары. Акрамя таго, неабходна будзе знайсці і падкрэсліць у запісанай частцы прыметнікі.

**VI. Падвядзенне вынікаў урока.**

— З будовай тэксту якога тыпу пазнаёміліся на ўроку? З якіх частак складаецца тэкст-апісанне? Слоў якой часціны мовы шмат у тэксце-апісанні? Чаму?

## Урок 9. Тэкст-разважанне

***Мэты:*** пазнаёміць са схемай пабудовы тэксту-разважання, вучыць складаць тэкст-разважанне, адпрацоўваць уменне дзяліць тэкст на часткі; узбагачаць слоўнікавы запас вучняў прыказкамі пра сяброўства, вернасць, удзячнасць, развіваць вуснае звязнае маўленне, лагічнае мысленне; выхоўваць сяброўскія адносіны паміж аднакласнікамі.

***Абсталяванне:*** карткі з тэкстам для арганізацыі самастойнай працы.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Да якога тыпу належыць тэкст «Восень»? Слоў якой часціны мовы шмат у тэксце-апісанні? Прачытайце тую частку тэксту, якую вы запісалі. Якія прыметнікі вы падкрэслілі ў запісаных сказах? *(Залацістым, чырвоныя, сінія, спелых, рознакаляровыя, асенніх, празрыстым, серабрыстыя.)* Якія правілы правапісу вы прымянілі, каб уставіць у словы прапушчаныя літары? *(Правілы правапісу літар о, э — а і літар е, ё — я.)* Раскажыце гэтыя правілы. Пры запісе якіх слоў выкарысталі правіла правапісу літар *е, ё — я*? *(Бяроз, зямлю, рознакаляровыя, серабрыстыя.)* Якія літары ўставілі ў гэтыя словы? Чаму? Пры запісе якіх слоў выкарысталі правіла правапісу літар *о, э — а*? *(Шалясцяць, залацістым, галінкі.)* Якія літары ўставілі ў гэтыя словы? Чаму? Падбярыце да слоў *залацістым, галінкі* аднакаранёвыя так, каб замест *а* трэба было пісаць *о*. *(Золата, пазалота, голле.)* Падбярыце да слова *шалясцяць* аднакаранёвае так, каб замест *а* трэба было пісаць *э*. *(Шэлест.)*

**II. Паўтарэнне.**

Вучням раздаюцца карткі з тэкстам.

> У Алёшкі шмат мадэлей розных самалётаў. У зале яны ўсюды — і на стале, і на кніжнай паліцы, і на падаконніку. Нават вісяць на сценах, на столі. Тут і магутныя бамбардзіроўшчыкі, і шустрыя знішчальнікі, і лёгкія лайнеры. Нямала ў калекцыі і верталётаў. З фюзеляжаў некаторых вытыкаюцца невялічкія дулы кулямётаў.
>
> Уражаны захапленнем хлопчыка авіяцыяй, я падумаў, што з яго абавязкова выйдзе некалі добры лётчык або авіяканструктар. *(І. Стадольнік* [2, с. 80]*)*
>
> ***Фюзеляж — корпус самалёта, верталёта, які служыць для размяшчэння экіпажа, пасажыраў і грузаў.***

— Прачытайце тэкст. Якая калекцыя ёсць у Алёшкі? Да якога тыпу належыць тэкст? (Выслухоўваюцца адказы вучняў.) Падбярыце да тэксту загаловак. (Вучні прапаноўваюць свае варыянты.) Запішыце яго. Знайдзіце і абвядзіце прыметнікі, якія дапамагаюць апісаць калекцыю хлопчыка. (Пасля самастойнага выканання задання вучнямі арганізоўваецца ўзаемаправерка.) Прачытайце сказ, у якім аўтар выказвае свае адносіны да захаплення Алёшкі. (Адзін з вучняў зачытвае апошні сказ тэксту.) З якіх частак складаецца тэкст-апісанне?

**III. Вывучэнне новага матэрыялу.**

***1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.***

— Сёння мы больш падрабязна пазнаёмімся з будовай тэксту-разважання, будзем вучыцца складаць тэксты гэтага тыпу.

***2. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 44.

— Прачытайце тэкст. (Чытанне вучнямі па частках.) Чаму дзень нараджэння з'яўляецца сямейным святам? (Выслухоўваюцца адказы вучняў.) Колькі частак можна вылучыць у тэксце? *(Тры.)* Аб чым нагадвае нам аўтар у першай частцы? *(Трэба памятаць дні нараджэння сваякоў.)* Прачытайце, як ён раіць віншаваць сваякоў. (Адзін з вучняў чытае другую частку тэксту.) Які вывад робіцца ў апошняй частцы тэксту? *(Дзень нараджэння — сямейнае свята, блізкія табе людзі добра памятаюць святочную дату.)* Звярніцеся да схемы на с. 22 і адкажыце, што перадаецца ў змесце гэтага тэксту. (Доказ думкі аб тым, што дзень нараджэння — сямейнае свята і кожнаму прыемная ў гэты дзень увага з боку родных людзей.) Да якога тыпу належыць тэкст? *(Разважанне.)*

Праца з рубрыкай «Завяжы вузялок!».

— Давайце звернемся да рубрыкі «Завяжы вузялок!» на с. 32, дзе змешчана важная інфармацыя, якую трэба памятаць, і даведаемся, з якіх частак

складаецца тэкст-разважанне. (Спачатку настаўнік, а потым вучні чытаюць інфармацыю, змешчаную ў рубрыцы.) Назавіце часткі, з якіх складаецца тэкст-разважанне.

Практыкаванне 45.

— Прачытайце тэкст. (Вучні чытаюць самі сабе.) Да якога тыпу ён належыць? *(Тэкст-разважанне.)* Якая думка даказваецца ў тэксце? *(Не таму людзі сябруюць, што сышліся характарамі.)* Знайдзіце і прачытайце, як паводзяць сябе сябры. (Адзін з вучняў зачытвае трэці — шосты сказы тэксту.) Які вывад робіць аўтар? *(Вернасць і адданасць сяброўству — вялікія пачуцці.)*

— Колькі частак у тэксце? *(Тры.)* Прачытайце першую частку. (Адзін вучань зачытвае першы і другі сказы тэксту.) Пра што гаворыцца ў другой частцы тэксту? *(Пра тое, як паводзяць сябе сапраўдныя сябры.)* Знайдзіце і прачытайце вывад, да якога прыходзіць аўтар. (Адзін вучань зачытвае апошні сказ тэксту.) Колькі сказаў у трэцяй частцы тэксту? *(Адзін.)* Спішыце тэкст. Кожную частку запішыце з новага радка. (Вучні самастойна запісваюць тэкст.) Назавіце ў тэксце аднакаранёвыя словы. *(**Сябр**оўства, **сябр**уем, сябар.)* Выдзеліце ў іх корань. Назавіце ў тэксце формы аднаго і таго ж назоўніка. *(Сяброўств[а] — у сяброўств[е], сяброўств[у], сябар[ ] — сябр[а], характар[амі] — характар[ы].)* Выдзеліце ў іх канчаткі.

**IV. Замацаванне.**

***Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 46.

— Прачытайце. (Адзін вучань чытае верш, астатнія сочаць за правільнасцю чытання.) Якая думка даказваецца ў вершы? *(Унук і дзядуля — дружбакі.)* Прачытайце той сказ верша, у якім сфармулявана гэтая думка. (Адзін вучань чытае першы сказ.) Зачытайце, які доказ прыводзіць унук. Назавіце ў вершы словы, у якіх трэба правяраць правапіс парных звонкіх — глухіх зычных. *(Расклад, дзед.)* Вусна падбярыце праверачныя словы. *(Раскладу, дзядуля.)* Назавіце сінонімы да слова *дружбакі*. *(Сябры, прыяцелі.)* Запішыце гэтыя словы-сінонімы.

Практыкаванне 47.

— Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць? (Вучні выказваюць свае меркаванні.) Растлумачце правапіс выдзеленых літар. (Вучні па чарзе тлумачаць правапіс парных звонкіх — глухіх зычных, правапіс *д–дз, т–ц* у словах. Звяртаецца ўвага на націск у слове *самому* і на перадачу на пісьме націскнога галоснага.) Знайдзіце сярод сказаў пабуджальны. *(Апошні сказ.)* Запішыце па памяці адну прыказку на выбар. (Пасля запісу прыказкі арганізоўваецца самаправерка напісанага.)

Развіццё маўлення.

— Прачытайце прыказку, якую вы запісалі. Да зместу якога з прачытаных на ўроку тэкстаў яна падыходзіць? Дакажыце сваю думку. (Вучні, якія запісалі розныя прыказкі, называюць творы, да якіх падыходзіць кожная прыказка, і даказваюць сваю думку: *«Дзень нараджэння» — Як ты да людзей, так і людзі да цябе. Любіць увесь свет лагодны прывет;* «Сяброўства» — *Як ты да людзей, так і людзі да цябе. Мы з табою, як рыбка з вадою. Павер мне, як самому сабе; «Дружбакі» — Мы з табою, як рыбка з вадою.*)

Практыкаванне 48.

— Прачытайце. (Вучні чытаюць самі сабе.) З тэксту якога тыпу ўзяты пачатак і канцоўка? *(З тэксту-разважання.)* Прачытайце спалучэнні слоў, прапанаваныя ў практыкаванні. (Адзін вучань чытае, астатнія сочаць за правільнасцю вымаўлення слоў.) Вусна складзіце тую частку тэксту, якой не хапае. Выкарыстайце прачытаныя спалучэнні слоў. (Заслухоўваецца асноўная частка тэксту, складзеная некалькімі вучнямі. Затым адзін вучань чытае першы сказ, другі расказвае другую частку тэксту, трэці зачытвае апошні сказ.) Перакажыце тэкст-разважанне, які ў нас атрымаўся. (Некалькі вучняў падрабязна пераказваюць тэкст-разважанне.)

Тэкст можа быць прыкладна такім:

*Чаму трэба берагчы кнігу*

*Кніга — гэта крыніца ведаў і надзейны сябар чалавека.*

*Кнігі расказваюць пра незвычайныя мясціны на зямлі. У іх можна прачытаць смешныя гісторыі і даведацца пра цікавыя здарэнні. Яны даюць адказы на розныя пытанні і такім чынам перадаюць мудрасць народа. Да цікавых кніг пастаянна звяртаюцца. Яны становяцца сапраўднымі сябрамі чалавека. Іх перадаюць дзецям і ўнукам. Так кнігі набываюць доўгае жыццё.*

*Чым больш кніга жыве, тым больш яе любяць і шануюць.*

**V. Дамашняе заданне.**

Практ. 49.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе вызначыць тып тэксту, спісаць яго, устаўляючы ў словы патрэбныя літары, знайсці і падкрэсліць словы, якія паўтараюцца і дапамагаюць звязаць сказы ў тэксце.

**VI. Падвядзенне вынікаў урока.**

— З будовай тэксту якога тыпу пазнаёміліся на ўроку? З якіх частак складаецца тэкст-разважанне?

## Урок 10. Вобразна-выяўленчыя сродкі мовы ў тэксце

***Мэты:*** на практычным узроўні паказаць варыянты раскрыцця адной і той жа тэмы ў тэкстах розных стыляў і жанраў; вучыць знаходзіць вобразна-выяўленчыя сродкі мовы ў мастацкім тэксце, пашыраць гатовы тэкст вобразна-выяўленчымі сродкамі; развіваць уменне вызначаць тып тэксту; узбагачаць слоўнік вучняў сінонімамі, развіваць эрудыцыю, звязнае маўленне навучэнцаў, выхоўваць культуру маўлення.

***Абсталяванне:*** карткі з тэкстам для арганізацыі самастойнай працы.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце тэкст, які вы запісалі дома. Якую назву можна яму даць? *(«Скорагаворкі», «Для чаго

*патрэбны скорагаворкі».)* Да якога тыпу ён належыць? *(Разважанне.)* Прачытайце сказ, у якім фармулюецца пытанне, на якое даецца адказ у тэксце. *(Першы сказ.)* Прачытайце сказ, у якім змешчаны вывад, да якога прыходзіць аўтар. *(Апошні сказ.)* Якія правілы правапісу вы прымянілі, каб уставіць у словы прапушчаныя літары? *(Правілы правапісу літар т — ц, у — ў, е, ё — я, зацвярдзелых зычных.)* Раскажыце гэтыя правілы. Пры запісе якіх слоў выкарысталі правіла правапісу літар *т — ц? (Дапамагаюць, сказаць, вымавіць, гаварыць, развіваюць.)* Якую літару ўставілі ў гэтыя словы? Чаму? Пры запісе якога слова выкарысталі правіла правапісу літар *у — ў? (Галоўнае.)* Якую літару ўставілі ў гэтае слова? Чаму? Пры запісе якога слова карысталіся правілам перадачы на пісьме зацвярдзелых зычных? *(Прыгожа.)* Якую літару ўставілі ў гэтае слова? Чаму? Пры запісе якога слова выкарысталі правіла правапісу літар *е, ё — я*? *(Весела.)* Якую літару ўставілі ў гэтае слова? Чаму?

**II. Паўтарэнне.**

Вучням раздаюцца карткі з тэкстам.

> Нідзе не збіраў я столькі баравікоў, як у верасах.
>
> І вось якое тлумачэнне такому суседству. Верасу катастрафічна не хапае азоту, таму ён прывык жыць у цеснай садружнасці з грыбамі. Грыбніца амаль заўсёды аплятае верасовыя карэньчыкі, здабываючы для іх азот з перагною. Некаторыя прасцейшыя грыбы нават жывуць у карэнні верасу. Так вось. *(Паводле Х. Гурыновіча* [3, с. 19]*)*
>
> ***Перагной — частка глебы, якая ўтварылася з рэштак жывёльных і раслінных арганізмаў.***
>
> ☐ Якое здарэнне адбылося ў лесе?
> ☐ Чаму ў верасе заўсёды расце шмат грыбоў?
> ☐ Як выглядае верас?

— Прачытайце тэкст. Пастаўце знак v у квадраціку насупраць таго пытання, на якое даецца адказ у тэксце. Вызначыце тып тэксту. З якіх частак складаецца тэкст-разважанне? Знайдзіце ў тэксце аднакаранёвыя словы. Выдзеліце ў іх корань. У формах аднаго і таго ж слова выдзеліце канчаткі. (Пасля самастойнага выканання задання вучнямі праводзіцца франтальная праверка: *верас[ах] — верас[у]*, ***верасу** — **верас**овыя*, ***грыб**ы — **грыб**ніца*, *грыб[амі] — грыб[ы]*, ***карэнь**чыкі — у **карэнні***, *азот[у] — азот[ ].*)

**III. Вывучэнне новага матэрыялу.**

***1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.***

— Сёння мы прыгадаем асаблівасці тэкстаў розных тыпаў, пазнаёмімся са словамі і выразамі, якія дапамагаюць маляўніча расказаць пра падзеі і дзеянні, стварыць вобразныя апісанні прадметаў, людзей, прыроды, ярка і вобразна даказаць пэўную думку.

***2. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 50.

— Прачытайце тэксты. *(Тры вучні па чарзе чытаюць тэксты.)* Якой тэмай яны аб'яднаны? *(Тэксты пра елку.)* Вызначыце тып тэкстаў. *(Апісанне.)* У якім тэксце елка апісваецца дакладна, а ў якіх — вобразна? *(У другім — дакладна, у першым і трэцім — вобразна.)* Які тэкст можна сустрэць у энцыклапедыі, а які — у мастацкай кнізе? Знайдзіце ў першым і другім тэкстах прыметнікі, якія дапамагаюць апісаць елку. Назавіце іх. *(Прывабная, зграбная, роўныя, пругкія, незвычайныя, серабрыстыя, дзівоснай; сасновых, вечназялёных, высокіх.)* На каго падобная елачка ў вершы? *(На курачку.)* Назавіце словы і выразы, якія падказалі вам гэта. *(Нібыта квактуха, прысела, крылы распусціла, прыбягуць яляняткі, будуць дзяўбці зярняткі.)* Запішыце тыя радкі верша, у якіх апісваецца елачка. (Запіс з каменціраваннем першага і другога сказаў.)

**IV. Замацаванне.**

***Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 51.

— Прачытайце тэкст. (Вучні чытаюць самі сабе.) На што падобныя кураняты? *(На клубочкі нітак.)* Якія словы падказалі вам гэта? *(Дзесяць маленькіх жоўценькіх пухнаценькіх клубочкаў, жоўтыя клубочкі коцяцца.)* Растлумачце значэнне выдзеленых слоў і выразаў. Карыстайцеся словамі для даведкі. (Вучні па чарзе чытаюць сказы тэксту, тлумачаць значэнне выдзеленых слоў у іх.) Чаму аўтар выкарыстаў у тэксце менавіта гэтыя словы і выразы? *(Каб стварыць вобразнае апісанне курыцы і куранят.)* Да якога тыпу належыць тэкст? *(Апісанне.)* Спішыце, раскрываючы дужкі. Падкрэсліце словы, ужытыя ў пераносным значэнні. (Запіс з каменціраваннем. Графічнае выдзяленне слоў *клубочкі, коцяцца,* устойлівага выразу *вадой не разальеш*.)

Практыкаванне 52 (праца ў парах).

— Папрацуйце ў парах. Вусна дапоўніце сказы тэксту патрэбнымі словамі і выразамі. (Пасля выканання задання заслухоўваюцца варыянты тэкстаў некалькіх пар вучняў.) Назавіце словы, ужытыя ў пераносным значэнні. (Вучні знаходзяць сярод слоў, якімі дапоўнілі сказы, тыя, якія ўжыты ў пераносным значэнні: *круціўся, каменем зваліўся, загарэліся, выскачылі.*) Да якога тыпу належыць тэкст? *(Апавяданне.)* Колькі частак можна вылучыць у ім? *(Тры.)* Пра што ідзе размова ў першай (другой, трэцяй) частцы? Прачытайце гэтую частку тэксту. *(Першая частка — першы і другі абзацы тэксту, другая частка — трэці абзац, трэцяя частка — чацвёрты абзац.)* Які малюнак вы намалявалі б да яе? Якую назву можна ёй даць? (Выслухоўваюцца прапановы вучняў, выбіраецца і запісваецца найбольш удалая назва.)

*Прыкладны план:*

*1. Усе заняты сваімі справамі.*

*2. Кот прыходзіць на дапамогу чубатцы.*

*3. Удзячнасць бабулі.*

Практыкаванне 53.

— Прачытайце. (Адзін вучань чытае верш, астатнія сочаць за правільнасцю чытання.) На якое пытанне дае адказ аўтар верша? *(Чаму рака мялее летам?)* Які гэта адказ: сур'ёзны ці жартоўны?

*(Жартоўны.)* Звярніцеся да слоўніка ў практыкаванні і адкажыце, якое значэнне мае дзеяслоў *млець*. Падбярыце сінонімы да слова *зашмат*. *(Шмат, многа.)*

Развіццё маўлення.

— Патлумачце, чаму на самай справе рэкі летам мялеюць. (Усе, хто жадае, выказваюць свае меркаванні.) Мы атрымалі некалькі розных адказаў на гэтае пытанне. Каб праверыць, які з іх правільны, вучні, якія лічаць сябе сапраўднымі знаўцамі прыроды, могуць выканаць заданне для эрудытаў на с. 38. Вам неабходна будзе скласці невялікае паведамленне з 3–4 сказаў. Патрэбныя звесткі пра выпарэнне вады вы зможаце знайсці ў дзіцячай энцыклапедыі або ў інтэрнэце.

— Да якога тыпу належыць тэкст? *(Разважанне.)* Дакажыце.

**V. Дамашняе заданне.**

Практ. 54.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе спісаць верш, устаўляючы ў словы патрэбныя літары, знайсці і падкрэсліць словы, ужытыя ў пераносным значэнні.

**VI. Падвядзенне вынікаў урока.**

— Чым адрозніваюцца тэксты на адну і тую ж тэму ў мастацкіх кнігах і ў энцыклапедыях? У якім значэнні часцей ужываюцца ў тэкстах словы, якія дапамагаюць маляўніча расказаць пра падзеі і дзеянні, стварыць вобразныя апісанні, ярка і вобразна даказаць пэўную думку? *(У пераносным значэнні.)*

## Урок 11. Навучальны падрабязны пераказ

***Мэты:*** выпрацоўваць уменне вызначаць тып тэксту, падзяляць яго на часткі, аднаўляць дэфармаваны план, падрабязна пераказваць тэкст-апавяданне па плане; узбагачаць слоўнік вучняў сінонімамі, развіваць звязнае пісьмовае маўленне, кемлівасць; выхоўваць клапатлівыя адносіны да жывёл.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце верш, які запісалі. З чым параўноўваецца ў вершы павуцінка? *(З хусцінкай.)* Што нагадваюць паэтэсе расінкі на павуцінцы? *(Ліхтарыкі.)* Якія словы ў вершы ўжыты ў пераносным значэнні? *(Хусцінка, гараць.)* Якую літару вы ўставілі ў словы на месцы пропускаў? Чаму?

**II. Паўтарэнне.**

***Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 55.

— Прачытайце загадку. Якую яна мае адгадку? *(Вавёрка.)* З чым параўноўваецца ў загадцы вавёрка? *(З яркай зоркай.)* Якія прыметнікі сустрэліся ў загадцы? *(Спрытны, вогненны, яркай.)* Які з іх ужыты ў пераносным значэнні? *(Вогненны.)*

Практыкаванне 56.

— Чым харчуюцца вавёркі? (Выслухоўваюцца адказы вучняў.) Прачытайце скорагаворку. (Вучні практыкуюцца ў хуткім і правільным чытанні скорагаворкі.) Знайдзіце ў скорагаворцы формы аднаго і таго ж слова. (Звяртаецца ўвага на розныя формы назоўніка *арэх*.) Назавіце ў іхканчаткі. Якія дзеясловы сустрэліся ў скорагаворцы? *(Збірала, сабрала.)* У форме якога часу, ліку і роду яны ўжыты?

**III. Праца па развіцці маўлення.**

Практыкаванне 57.

***1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.***

Сёння мы з вамі будзем рабіць падрабязны пераказ апавядання Янкі Галубовіча «Вавёрачка». Як вы думаеце, пра каго пойдзе размова ў тэксце, мяркуючы па назве? Ці назіралі вы калі-небудзь за вавёркай? Што можаце расказаць пра яе?

***2. Аналіз тэксту.***

— Прачытайце тэкст. (Чытанне тэксту: адзін раз ціха, другі раз — услых.) Навошта ляснік і яго ўнук выправіліся ў лес? *(Каб зрабіць абход, паглядзець, ці ўсё добра ў лесе.)* Каго сустрэлі дзед і Сяргейка? *(Вавёрачку.)* Што незвычайнага было ў яе паводзінах? *(Яна скакала толькі на трох лапках, пярэдняй да зямлі не дакраналася.)* Што зрабілі ляснік з унукам? *(Забралі вавёрачку дадому і пачалі яе выходжваць.)* Што здарылася праз месяц? *(Лапка ў вавёрачкі зажыла, і Сяргейка выпусціў яе ў лес.)*

— Растлумачце значэнне спалучэння слоў *бярэ ў абход* (*абход — участак лесу, які даглядаецца, абслугоўваецца адным леснікам; бярэ ў абход — бярэ ўнука і абыходзіць участак лесу, які даглядае*), слоў *шмыганула* (*шмыгнула, хутка знікла*), *вёрткая* (*здольная да хуткіх і спрытных рухаў*).

— Каротка сфармулюйце, пра што трэба будзе сказаць у пераказе. *(Пра тое, як дзед з унукам сустрэлі ў лесе хворую вавёрачку, забралі яе дадому, пачалі выходжваць, праз месяц вылечылі і выпусцілі ў лес.)* А зараз падрабязна раскажыце, як адбылася сустрэча з вавёрачкай у лесе. *(Дзед у Сяргейкі ляснік. Ён часта бярэ хлопчыка ў свой абход. Аднойчы вечарам дзед і Сяргейка вярталіся дамоў. На сцяжынцы яны ўбачылі вавёрачку. Тая ўбачыла людзей і шмыганула ў траву, потым скокнула да кустоў на трох лапках. Пярэдняй яна да зямлі не дакраналася.)* У якім выпадку вы раскрылі тэму тэксту правільна, хоць і коратка (у адным сказе)? У якім выпадку вы перадалі частку тэксту ва ўсіх дэталях, з захаваннем вобразных слоў і выразаў? Сёння будзем перадаваць змест тэксту падрабязна. Вам неабходна будзе нічога не прапусціць, раскрыць тэму і правільна перадаць галоўную думку ў сваім тэксце.

***3. Аднаўленне дэфармаванага плана.***

— Да якога тыпу належыць тэкст «Вавёрачка»? *(Апавяданне.)* На колькі частак яго можна падзяліць? (Вучні выказваюць свае меркаванні.) Прачытайце першую (другую, трэцюю, чацвёртую) частку тэксту. *(Першая частка — першы і другі абзацы тэксту, другая частка — трэці абзац, трэцяя частка — чацвёрты абзац, чацвёртая частка — пяты і шосты абзацы тэксту.)* Прачытайце план на старонцы 40 падручніка. Ці адпавядае паслядоўнасць пунктаў плана паслядоўнасці частак у тэксце? *(Не.)* Як яе трэба змяніць? *(1 — 4 — 3 — 2.)* Запішыце выпраўлены план.

***4. Вусны пераказ тэксту па плане.***

— Вусна перакажыце тэкст, выкарыстоўваючы запісаны план. (Заслухоўваюцца пераказы 1–2 вучняў.)

***5. Арфаграфічная і пунктуацыйная падрыхтоўка.***

Падчас арфаграфічнай работы асобая ўвага звяртаецца на словы ***таксама***, *пры**й**шлося*. Папярэджваюцца пунктуацыйныя памылкі вучняў у сказах з аднароднымі членамі. Звяртаецца ўвага на форму дзеяслова-выказніка (ужываецца ў множным ліку) у сказах са складаным дзейнікам: *Аднойчы пад вечар дзед і Сяргейка* ***вярталіся*** *дамоў. Сяргейка з дзедам* ***прынеслі*** *вавёрачку дамоў,* ***змазалі*** *ёдам ранку,* ***забінтавалі*** *лапку.*

***6. Напісанне пераказу вучнямі.***

***7. Самаправерка напісанага.***

Настаўнік фіксуе ўвагу вучняў на тым, што неабходна перачытаць напісаны пераказ двойчы. Пры першасным чытанні трэба прасачыць правільнасць выкладу зместу. Пры другасным — правільнасць напісання слоў, пастаноўкі знакаў прыпынку.

**IV. Дамашняе заданне.**

Практ. 58.

— Пры выкананні дамашняга задання вам неабходна будзе аднавіць дэфармаваны тэкст, вызначыць яго тып і запісаць, раскрываючы дужкі. Акрамя гэтага, трэба будзе знайсці і падкрэсліць у тэксце словы, якімі апісваецца зубраня.

**V. Падвядзенне вынікаў урока.**

— Да якога тыпу належыць тэкст «Вавёрачка»? Што вы склалі перад тым, як пісаць пераказ? Якія цяжкасці ўзніклі пры пераказе тэксту?

**Спіс выкарыстаных крыніц:**


1. *Мацвеенка, У. І.* Сябрынка : Вершы, загадкі, казкі : для малод. шк. узросту / У. І. Мацвеенка; маст. А. І. Гармаза. — Мінск : Юнацтва, 1995. — 127 с.
2. Вясёлка : Вершы, апавяданні, казкі, п'есы, песні / уклад. М. А. Маляўка. — Мінск : Маст. літ., 2012. — 279 с., іл.
3. *Гурыновіч, Хв.* Лес на далоні : Вершы, апавяданні : для дзяцей малод. шк. узросту / Хв. Гурыновіч; маст. У. А. Малахаў. — Мінск : Юнацтва, 2001. — 142 с.



***Свірыдзенка В. І.,***
*кандыдат педагагічных навук,*
*дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства БДПУ*


# Практыкаванні са слоўнікавымі словамі IV клас*

***Памочнік.***

*1. Разгадайце рэбус. Запішыце слова, якое ў вас атрымалася.*

па  ,,  ,,

*Утварыце і запішыце форму множнага ліку слоўнікавага слова.*

*2. Якія літары «збеглі» са слова? Злучыце іх з месцам пропуску ў слове.*

о ш ч а

п[..]мо[..]нік

*3. Устаўце ў словы патрэбныя літары. Злучыце прыметнікі з адпаведнымі назоўнікамі.*

| | |
|---|---|
| д..бры | армія |
| д..бротныя | памо..нік |
| доблесная | боты |

*Дапоўніце сказы патрэбным спалучэннем слоў.*

1) __________ __________ дапамагае бабулі ў хатніх справах. 2) Прыбіральшчыца падзякавала __________ __________ за працу. 3) Тата не змог бы прыбраць у кватэры за гадзіну без __________ __________. 4) Дзядуля абняў свайго __________ __________.

*Вызначыць род, лік і склон прыметнікаў.*

*4. Дапоўніце тэкст слоўнікавымі словамі. Падбярыце да яго загаловак.*

______________________

У нашай вёсцы праз рачулку перакінуты драўляны мосцік. З цягам часу некаторыя дошкі ў мосціку прагнілі і праваліліся.

* Малюнкі да слоўнікавых слоў змешчаны на каляровай укладцы.